З каталіцкіх СМІ Беларусі (25)

Аўтар: Рэдакцыя
20.02.2022 00:00

У Бабруйску прайшоў 7-ы Сямейны баль, у якім узялі ўдзел сужэнскія пары з розных мясцін. Незвычайная імпрэза, якая стала ўжо добрай традыцыяй, з'яўляецца ініцыятывай дабрачыннага фонду абароны жыцця і сям'і "Адкрытыя сэрцы" і накіравана на папулярызацыю хрысціянскіх каштоўнасцей. У сёлетнім калядным балі ўдзельнічала восем сужэнскіх пар. Тры гадзіны танцаў у канцэртнай зале бабруйскага санаторыя прайшлі ў атмасферы рамантыкі, шчырай радасці, узаемнай зацікаўленасці і любові.

Згаданы Баль – гэта не толькі танцы, феерычная атмасфера, новыя знаёмствы, гульні і добры настрой. Гэта яшчэ месца, дзе сужэнцы могуць пабыць разам. На жаль, у сучасным свеце, дзе пануе імклівы тэмп жыцця, на гэта часта не хапае часу. Таму сямейны баль – добрая магчымасць спыніцца, адарвацца ад мітусні, затрымацца на хвілінку і лепш адчуць асалоду ў тым, што мае такую прыгожую назву – сужэнства.

Пад'язджаючы да рыбных ставоў каля вёскі Шэметава, яшчэ ў 70-ыя гады мінулага стагоддзя можна было ўбачыць крыху нахілены невысокі крыж. Дамоў паблізу ніякіх не было, і крыж здаваўся такім самотным, быццам пакінутым. Але пры ім заўсёды было галубінае сямейства, а белы голуб вельмі часта сядзеў на перакладзіне крыжа. Нават не баяўся людзей, якія час ад часу падыходзілі да крыжа, на хвілінку затрымліваліся, просячы Бога аб здароўі, добрым надвор'і, дажджы і багатым ураджаі, а рыбакі – аб добрым улове. Вясною прасілі бласлаўлення на пачатак палявых прац, а таксама выганяючы сваіх кароў і авечак на пашу.

Яніна Іватовіч з вёскі Яневічы апавядала, што гэты крыж не раз спілоўвалі мясцовыя камуністы, але людзі знаходзілі яго і ставілі зноў. Ніхто не ведае дакладна, хто вяртаў крыж на месца, але людзі лічаць, што гэта маглі рабіць толькі рыбакі.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (25)

Аўтар: Рэдакцыя
20.02.2022 00:00



